Источник: "Культура" - 2012-09-15

# Новыя магчымасці і Інтэрнэт

**Да Дня бібліятэк Беларусі ЦНБ НАН арганізавала святочныя акцыі.**

На гэтым тыдні адбылася акцыя "Стань чытачом бібліятэкі бясплатна", у рамках якой кожны ахвотны мог бясплатна запісацца ў бібліятэку. Акрамя таго, праведзена апытанне наведвальнікаў бібліятэкі "Як вас сёння абслужылі?", пад час якога ўдзельнікі давалі адзнаку працы бібліятэкараў. Па сканчэнні тыдня кожны можа азнаёміцца з вынікамі экспрэс-апытання. Яшчэ адна акцыя, прызначаная для прыцягнення ўвагі да чытання — "Мяняем кнігу на кнігу", — дае магчымасць чытачу ўзяць сабе кнігу з прапанаваных бібліятэкай і, на выбар, прынесці замест яе выданне з дому. Па словах Вольгі Смык, гэтая акцыя зацікавіла не толькі наведвальнікаў, але і супрацоўнікаў, таму ў будучым магчыма яе паўтарэнне.

**Вольга НАВІЦКАЯ**